## Літаратурны каляндар

# ВЕЧНЫ АГОНЬ НАТХНЕННЯ

## ДА 55-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

26-га лістапада спаўняецца 55 гадоў з дня нараджэння беларускага пісьменніка Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча. Ён жыў і гарэў вечным агнём натхнення, знаходзіў свае новыя творчыя сцяжыны на шырокіх літаратурных гонях. На жаль, вельмі мала суджана было пражыць У. С. Караткевічу. У ліпені 1984 года перастала біцца сэрца «паэта зямлі з найменнем Беларусь». Айчынная літаратура страціла ў асобе пісьменніка аднаго з лепшых прадстаўнікоў, а наша беларуская зямля — аднаго са сваіх лепшых сыноў. Але літаратурная спадчына, пакінутая нам пісьменнікам, дазваляе паставіць яго імя побач з імёнамі іншых славутых беларускіх песняроў.

Кожны раз, калі я бяру ў рукі тую ці іншую кнігу У. С. Караткевіча, перачытваю знаёмыя з дзяцінства радкі, з новай сілай адчуваю радасць і захапленне, усхваляванасць і акрыленасць. І не пакідаюць пачуццё перажывання за яго герояў, аптымізм і вера ў дабро і чалавечнасць. Чытаеш творы У. Караткевіча і бачыш сваю Радзіму, «краіну пад белымі крыламі», бачыш неабсяжны свет, такі цудоўны і цікавы. Усе яго творы народжаны любоўю да роднай зямлі і яе народа. Пісьменнік выступаў як палымяны патрыёт сваёй зямлі, як чалавек і грамадзянін, заклапочаны яе лёсам, яе будучыняй. І У. С. Караткевіч зрабіў усё магчымае, каб паказаць месца свайго народа сярод іншых народаў, яго карані і вытокі, яго багатую, нялёгкую і цікавую гісторыю. Пісьменнік лічыў, што кожны народ сваімі каранямі і вытокамі адыходзіць углыб гісторыі. А калі ведаць гісторыю свайго краю, то будзеш адчуваць імкненні і спадзяванні, настрой і перажыванні народных мас. І таму гістарычная тэма з'явілася вядучай у творчасці пісьменніка.

Празаічныя творы У. С. Караткевіча, як і яго вершы, ставяць разнастайныя філасофскія праблемы. Цікавасць да твораў у чытача выклікаецца не толькі сюжэтам, але і пастаўленым у кожным творы філасофскім пытаннем. Філасофская думка аб вечнасці існавання Чалавека на Зямлі гучыць і ў гісторыка-філасофскім рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».

У гэтым творы пісьменнік сцвердзіў сябе як сапраўдны псіхолаг, як мастак, якому падуладны багатыя фарбы пры абмалёўцы характараў, пейзажу, побыту.

Раман «Каласы пад сярпом тваім» лічыцца адным з лепшых твораў У. Караткевіча. Ён адлюстраваў велічную барацьбу беларускага народа 1863 года супраць здзек і прыгнёту паноў. Мы захапляемся мужнасцю і гераізмам Кастуся Каліноўскага, Алеся Загорскага. Вобраз апошняга — князя па паходжанню і мужыка па выхаванню — з'явіўся новым ва ўсёй нашай літаратуры.

Цікавымі і арыгінальнымі сталі і аповесці У. Караткевіча «Цыганскі кароль», «Сівая легенда», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Чазенія», «Лісце каштанаў» і інш. Засталася нам і драматургічная спадчына пісьменніка: п'есы «Млын на Сініх Вірах», «Званы Віцебска», «Кастусь Каліноўскі». Яго п'еса «Калыска чатырох чараўніц» з'явілася апошнім драматычным творам пісьменніка.

У. Караткевіч добра заявіў сябе і ў жанры эсэ. Менавіта з яго «лёгкай рукі» у гэтым жанры пачалі працаваць В. Іпатава А. Карпюк, Я. Брыль. Эсэ У. Караткевіча дыхаюць жыццесцвярджальнасцю, усхваляюць зямное хараство, каханне, маладосць, радасць стваральнай працы.

Шматграннасць таленту У. Караткевіча праявілася і ў напісаных ім кінасцэнарыях да аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» і рамана «Чорны замак Альшанскі». Кінафільмы, пастаўленыя па гэтых сцэнарыях, заваявалі прызнанне шматлікіх гледачоў, былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі і дыпломамі.

У. Караткевіч валодаў арыгінальным, высокамастацкім талентам, быў верны ідэалам дабра і справядлівасці. Уся яго творчасць — гімн жыццю і чалавеку, гімн роднай Беларусі. І хочацца нагадаць радкі з верша Рыгора Барадуліна «Партрэт Уладзіміра Караткевіча»:

**Рэху мякка ў снягах,**
**Перасіплі вятры на таргах,**
**Перазяблі паляны...**
**Зноў паэт, наведаўшы**
**сцішаныя лясы,**
**З ночы ў ноч уздымае**
**паходні.**
**І ў азёрах вачэй**
**Пад сярпом схіляюцца**
**каласы,**
**І Хрыстос наважваецца**
**Прызямліцца ў Гародні...**

**Н. ПАДОЛЬСКАЯ,**
**студэнтка 4-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

## На кніжнай паліцы

# НАВІНКІ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ

У выдавецтве «Мастацкая літаратура» у апошнія два гады выйшлі цікавыя і значныя кнігі беларускіх аўтараў. Гэта творы розных жанраў—проза, паэзія, драматургія, літаратурная крытыка, літаратуразнаўчыя даследаванні.

Арыгінальныя празаічныя творы вядомых нашых пісьменнікаў, публіцыстаў, выдадзеныя «Мастацкай літаратурай», паступілі ў продаж і ў наш кніжны магазін. Іх мы прапануем набыць выкладчыкам, студэнтам ГДУ.

**БРЫЛЬ Я. Сёння і памяць. Апавяданні, мініяцюры, эсэ, лірычныя запісы.** На бел. мове. 1985 г.

Кнігам народнага пісьменніка Беларусі Я. Брыля ўласціва глыбіня аўтарскай думкі, поўнай трывогі за лёсы людзей і ўсёй нашай планеты, высокае літаратурнае майстэрства, крынічна чыстая народная мова. Усімі гэтымі вартасцямі валодае і новы зборнік Янкі Брыля. Дзень сённяшні і дзень учарашні паўстаюць, ажываюць у апавяданнях, эсэ, мініяцюрах, змешчаных тут, ва ўсёй сваёй шматграннасці. Гонар за выдатныя здзяйсненні нашых сучаснікаў і светлы смутак па незваротнаму мінуламу дзяцінству, радасць сустрэч, знаходак і гора страт — усё ў гэтай кнізе арганічна, усё сплецена ў тугі клубок жыцця.

«Сёння і памяць» — яркая таленавітая старонка ў шматграннай творчасці Я. Брыля.

**КАРПЮК А. Сучасны канфлікт.** Аповесць, апавяданні. На бел. мове. 1984 г.

У цэнтры аповесці «Сучасны канфлікт», якая дала назву кнігі, — сям'я інтэлігентаў. Муж — вучоны, жонка — настаўніца. У іх — развітыя дзеці, у доме дастатак. Але штосьці адбылося, недзе парушылася гармонія ва ўзаемаадносінах, і гэта прыводзіць да непапраўнай сямейнай драмы. Муж наўмысна гіне ў аўтамабільнай катастрофе.

Аўтар спрабуе разабрацца, у чым прычыны таго, што адбылося, як зрабіць, каб «міна замаруджанага дзеяння» не спрацавала ў іншых сем'ях.

**МАЛЬДЗІС А. Восень пасярод вясны.** Аповесць, сатканая з гістарычных матэрыялаў і мясцовых паданняў. На бел. мове. 1984 г.

Падзеі ў кнізе адбываюцца ў 1861 г. — адразу ж пасля адмены прыгоннага права, у перыяд бурных сялянскіх хваляванняў.

**ПАЎЛАЎ С. Імперская паранойя.** Памфлеты, нарысы. На бел. мове. 1984 г.

У аснове кнігі — асабістыя ўражанні і назіранні аўтара ад дзвюх паездак ў ЗША і іншыя краіны, ад удзелу ў важных міжнародных сустрэчах вучоных, журналістаў, дыпламатаў. Кніга напісана па гарачых слядах падзей. Яна пазнаёміць чытача з многімі міжнароднымі, маральна-этычнымі праблемамі, якія хвалююць чалавецтва на фінішы XX стагоддзя.

**ПТАШНІКАЎ І. Алімпіяда.** Раман. На бел. мове. 1985.

Новы раман пісьменніка прысвечаны сучаснай вёсцы. Гэта раман аб жанчыне Алімпіядзе, простай сельскай працаўніцы, якая перажыла вайну, пасляваенныя нястачы, аб яе каханні, вернасці.

**ХОМЧАНКА В. Чэкістам стала вядома.** Аповесць, апавяданні. На бел. мове, 1985.

У кнізе вядомага беларускага празаіка — гісторыка-дэтэктыўная аповесць «Аблава», апавяданні, эсэ.

Дакументальныя апавяданні пабудаваны на матэрыялах следства, якое вяла ЧК па справе эсэркі Ф. Каплан, страляўшай у Леніна.

Запрашаем наведаць наш магазін, набыць новыя кнігі беларускіх аўтараў.

**Н. ШАТОН,**
**прадавец кнігарні № 19.**

СПОРТ

# МАЙСТЭРСТВА МАЛАДЫХ

Напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка ў г. Слоніме праходзіў чэмпіянат Беларусі па ручному мячу сярод дзяўчат 1968-1969 гадоў нараджэння. За зборны калектыў Гомельскай вобласці выступалі студэнткі нашага універсітэта. Яны з'явіліся аднымі з галоўных прэтэндэнтак за перамогу. Рашаючай стала сустрэча з мінчанкамі. Ва ўпартай барацьбе з лікам 24:22 верх узялі сталічныя спартсменкі, якія сталі чэмпіёнкамі рэспублікі. Гамяльчанкі — ўладальніцы сярэбраных узнагарод. Ва ўсіх астатніх матчах яны дабіліся пераканаўчых перамог: над камандай Гродна — 35:24, Брэста — 34:24, Магілёва — 28:22, Слоніма — 40:12.

Разам з медалямі наша каманда заваявала права ўдзельнічаць у чэмпіянаце СССР сярод дзяўчат, які пачнецца 2 студзеня будучага года.

Неабходна адзначыць высокі клас гульні, які прадэманстравалі на прайшоўшым турніры першакурсніцы Святлана Серанкова і Наталля Стрыжнёва з факультэта фізвыхавання і Лілія Марозава з біяфака.

У тыя ж дні ў Алма-Аце разыгрывалася першынство ЦС СДСТ «Буравеснік» па ручному мячу. Гонар Беларусі абараняла другакурсніца факультэта фізвыхавання Алена Кузняцова. Яна вярнулася са спаборніцтваў з вышэйшай узнагародай.

**В. КРУКОЎСКІ,**
**трэнер каманды.**

# У НЕВЫСОКІМ ТЭМПЕ

230 лепшых бегуноў усіх факультэтаў прынялі ўдзел ва універсітэцкім асеннім лёгкаатлетычным кросе. Дзяўчаты мераліся сіламі на дыстанцыях 500 і 1000 м. Пераможцамі сталі адпаведна Ала Туркова з факультэта фізвыхавання (1.23,0) і Святлана Кутасава з матфака (3.27,5).

Юнакі спаборнічалі на дыстанцыях 1000 і 3000 м. Тут мацнейшымі аказаліся студэнты факультэта фізвыхавання Сяргей Нікіценка і Анатоль Механікаў. Іх вынікі адпаведна 2.56,7 і 5.57,0.

У камандным заліку перамаглі лёгкаатлеты факультэта фізвыхавання. На наступных месцах размясціліся спартсмены фізічнага, матэматычнага, гісторыка-філалагічнага, геалагічнага, біялагічнага і эканамічнага факультэтаў.

Нельга не адзначыць, што сёлета ўзровень вынікаў у параўнанні з мінулагоднім знізіўся. Так што ёсць над чым задумацца трэнерам.

**А. САВЯНОК,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў.**



**НА ЗДЫМКУ:** адзін з забегаў лёгкаатлетычнага кросу.

Фота Д. Баярына.

# І МЕДАЛЬ, І ЗАПАВЕТНЫ НАРМАТЫЎ

Яшчэ да паступлення ва універсітэт Эдуард Шпакаў стаў выхаванцам яго ДЮСШ. Юнак захапляецца барацьбой самба. Разам з іншымі спецыялістамі яго трэніруе Л. І. Сарокін. Хутка расце майстэрства здольнага асілка. Нядаўна першакурснік факультэта фізвыхавання Э. Шпакаў удзельнічаў у чэмпіянаце рэспублікі па барацьбе самба. У сваёй вагавай катэгорыі ён стаў бронзавым прызёрам і выканаў запаветны норматыў для атрымання сярэбранага значка «Майстар спорту СССР».

(Наш кар.).

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Калектыў бібліятэкі універсітэта выказвае глыбокае спачуванне бібліятэкару ТАЎСТАНАВАЙ Людміле Васільеўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.

А3 42626

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, к. 3-11, т. 57-16-52.